**А. М. ЛАТУШКІН**

# КАЛЕКЦЫЯ ТОМАША НЕВАДНІЧАНСКАГА І ЯЕ КАШТОЎНАСЦЬ ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Раскрываецца склад і навуковая каштоўнасць прыватнага збору гістарычных матэрыялаў Томаша Неваднічанскага. Даецца інфармацыя аб парадку доступу даследчыкаў да калекцыі. Характарызуецца каштоўнасць комплексу рукапісных дакументаў XV—XVIII стст., што адлюстроўваюць гісторыю Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Праводзіцца аналіз паходжання рукапісаў, якія маюць непасрэдныя адносіны да роду князёў Радзівілаў; ажыццяўляецца спроба складання спіса актаў, адрасаваных Радзівілам. Падкрэсліваецца роля дзейнасці Т. Неваднічанскага як мецэната і папулярызатара айчыннай гісторыі.

The article deals with the composition and the scientific value of the private collection of historical materials of Tomasz Newadniczanski. The author describes the order of access to the collection for the researchers. The author evaluates the value of the body of handwritten documents from XV—XVIII ct., which reflects the history of the Grand Duchy of Lithuania and the Kingdom of Poland. The author analyses the origins of the manuscripts directly related to the Radziwill princes and attempts to make a list of acts addressed to the Radziwills. The importance of T. Newadniczanski's activities as a patron and popularizer of his country's history is emphasized.

*Ключавыя словы*: Томаш Неваднічанскі (1933—2010); крыніцазнаўства гісторыі Беларусі; калекцыяніраванне; мапы; картаграфія Беларусі; рукапісы; Жыгімонт II Аўгуст; род Радзівілаў; гравюра Адэльгаўзера (Johannes Adelhauser) і Цюндта (Mathias Zündt) 1568 г. «Сапраўднае апісанне горада Гродна ў Літве».

*Keywords*: Tomasz Newadniczanski (1933—2010); source studies of history of Belarus; collectors; maps; cartography of Belarus; manuscripts; Sigismund II Augustus; the Radziwills; the gravure of 1568 «The authentic depiction of the town of Grodna in Lithuania» by Johannes Adelhauser and Mathias Zündt.

---

**Латушкін Андрэй Мікалаевіч** — дацэнт кафедры крыніцазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук.

Асоба Томаша Неваднічанскага (1933—2010) вядома ў Беларусі толькі вузкім колам спецыялістаў-крыніцазнаўцаў і калекцыянераў[1]. Аднак яго ўнёсак у справу збірання айчыннай гістарычный спадчыны можна прызнаць неперaўзыйдзеным.

**Біяграфія.** Томаш Неваднічанскі нарадзіўся 25 верасня 1933 г. у Вільні. Бацька, Генрых Неваднічанскі, — фізік, прафесар універсітэта імя Стэфана Баторыя. У 1945 г. сям'я Неваднічанскіх пераехала ў Кракаў. Гэта стварыла ўмовы для паступлення Томаша ў адзін са старэйшых універсітэтаў Еўропы: пасля заканчэння ліцэя імя Навадворскага ў Кракаве, абраўшы прафесійны шлях бацькі, ён паступіў на фізічны факультэт Ягелонскага ўніверсітэта. Т. Неваднічанскі атрымаў тытул магістра ў 1955 г. У 1955—1957 гг. працаваў у Інстытуце ядзерных даследаванняў Польскай акадэміі навук у Варшаве. Потым праходзіў навуковую стажыроўку ў Інстытуце фізікі федэральнай палітэхнічнай школы ў Цюрыху. Працягваў працу ў гэтай установе да 1963 г. Атрымаў навуковую ступень доктара ў галіне ядзернай фізікі. Ажаніўся з Марыяй Луізай Сімон. Пасля вяртання ў Польшчу працаваў у Інстытуце ядзерных даследаванняў у Сверску пад Варшавай. Пад кіраўніцтвам Неваднічанскага былі паспяхова здзейснены работы па запуску лінейнага паскаральніка. У 1970 г. Т. Неваднічанскі эміграваў у ФРГ. Як мяркуецца, ён не мог пагадзіцца з «сацыялістычнай» рэчаіснасцю тагачаснай Польшчы. Да 1973 г. працаваў у Інстытуце даследаванняў цяжкіх іонаў у Гайдэльбергу і Дармштаце, пасля чаго пакінуў навуковую кар'еру і заняўся бізнесам, працаваў у Бітбургу на пасадзе фінансавага дырэктара ў піваварнай кампаніі «Bitburger».

**Калекцыянерская і мецэнацкая дзейнасць.** Зборам старажытнасцей Т. Неваднічанскі пачаў займацца з 1968 г. Як мяркуецца, першай у яго калекцыі была выява Дамаска з выдання Браўна і Гогенберга 1576 г. — падарунак жонкі. Спектр далейшых аб'ектаў калекцыяніравання пастунова стаў даволі шырокім, ахапіўшы найбольш рэдкія матэрыялы, што мелі адносіны да гісторыі і літаратуры Польшчы. Аднак асноўную масу склалі картаграфічныя матэрыялы. Так, агульная колькасць мап тэрыторыі Рэчы Паспалітай (далей — РП) і яе асобных рэгіёнаў, відаў яе гарадоў — каля 2300 шт. За 40-гадовы перыяд калекцыянерскай дзейнасці Т. Неваднічанскі стаў адным з самых вядомых у Еўропе калекцыянераў. Акрамя таго, у калекцыю ўвайшлі лісты, рукапісы вядомых пісьменнікаў і паэ-

[1] Матэрыялы калекцыі Т. Неваднічанскага траплялі пад увагу даследчыкаў гісторыі архітэктуры горада Гродна другой паловы XVI ст. (гравюра Адэльгаўзера і Цюндта 1568 г. «Сапраўднае апісанне горада Гродна ў Літве» і яе пазнейшыя перавыданні) [4].

таў, кнігі з дарчымі надпісамі аўтараў, напрыклад рукапісы 42 твораў А. Міцкевіча. Асаблівую цікавасць уяўляе комплекс (некалькі тысяч) дакументаў XV—XVIII стст. па гісторыі ВКЛ і Каралеўства Польскага.

Т. Неваднічанскі адрозніваўся ў калекцыянерскім асяроддзі актыўнай грамадска-асветніцкай пазіцыяй. Разумеючы каштоўнасць сваіх збораў, ён вёў шырокую дзейнасць па іх папулярызацыі, апрацоўцы і навуковым выкарыстанні. Мэта, якую меў калекцыянер, — раскрыццё праз матэрыялы калекцыі гісторыі РП, абуджэнне цікавасці і пашаны да яе. Асноўнай формай рэпрэзентацыі яго збораў стала серыя выстаў міжнароднага характару, якія праводзіліся пад патранатам кіраўнікоў дзяржаў і арганізоўваліся ў розных краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы — Германіі[2], Польшчы[3], Літве[4], Украіне. Кожная з іх, як правіла, суправаджалася выданнем ілюстраванага каталога з падрабязнымі анатацыямі. Серыя гэтых каталогаў пад назвай «Imago: Germaniae», («...Poloniae», «...Lithuaniae», ...Ukraniae», «...Silesiae») стала ўдалым рашэннем, значна пашыраючы магчымасці знаёмства з выставамі. Зараз каталогі выступаюць самастойным даведнікам, своеасаблівым гідам па зборах Т. Неваднічанскага, з'яўляюцца бібліяграфічнай рэдкасцю.

Высокія грамадскія мэты, а таксама чалавечыя якасці Т. Неваднічанскага пацвярджаюцца значнай па маштабах і адметнай па формах мецэнацкай дзейнасцю. Калекцыянер актыўна перадаваў у дар навуковым і мемарыяльным установам свае матэрыялы. Так, першую частку калекцыі — каля 100 гістарычных мап Памор'я і каля 200 малюнкаў і гравюр з відамі Шчэцына і паморскіх гарадоў — падараваў у 1998 г. Шчэцынскаму ўніверсітэту. У 2002 г. фундацыя «Ossolineum» у Вроцлаве атрымала ад яго ў дар каля 200 мап і матэрыялаў з відамі Сілезіі. Адноўленаму Палацу вялікіх князёў літоўскіх у Вільні Т. Неваднічанскі перадаў у дар адзін з экзэмпляраў знакамітай гравюры Адэльгаўзера-Цюнта «Сапраўднае апісанне горада Гродна ў Літве» (лац. «Vera designatio urbis in Littavia Grodnae»). Апошняй воляй мецэната стала перадача ўсёй калекцыі на вечнае захоўванне ў музей Каралеўскага Замку ў Варшаве[5].

---

[2] У межах серыі выстаў Imago Polonia: Дзяржаўная бібліятэка ў Берліне, красавік — чэрвень 2002 г.; увесну 2004 г. у Дзяржаўным музеі ў Дармштаце.

[3] Серыя выстаў Imago Polonia: Каралеўскі Замак у Варшаве, 14.11—29.12.2002; Нацыянальны музей у Кракаве, 07.02—31.03.2003; Нацыянальны інстытут імя Асалінскіх у Вроцлаве, 24.04—30.06.2003.

[4] Выстава «*Imago Lithuaniae*», Вільня, Віленская карцінная галерэя Літоўскага мастацкага музея (былы палац Хадкевічаў), 17.09—30.11.2003.

[5] Першапачаткова сваю калекцыю мецэнат планаваў падарыць польскім музеям пад умовай, што Польшча верне Германіі зборы так званай Прускай Бібліятэкі з Бібліятэкі Ягелонскага універсітэту ў Кракаве. Змяніў сваё рашэнне незадоўга да смерці.

За некалькі месяцаў да сваёй смерці 1 кастрычніка 2009 г. Т. Неваднічанскі атрымаў узнагароду Міністэрства культуры Польшчы — Залаты медаль «Заслужаны дзеяч культуры Gloria Artis».

**Склад калекцыі рукапісаў** Т. Неваднічанскага дастаткова разнастайны. Найбольшай увагі заслугоўваюць матэрыялы па беларускай гісторыі, больш сцісла асветлена калекцыя рукапісных дакументаў перыяду ВКЛ. Асноўнай крыніцай інфармацыі для даследчыка могуць выступаць каталогі выстаў «Imago Poloniae», «Imago Lithuaniae», «Imago Ukraniae»; рэкламны праспект серыі выстаў «Imago Poloniae» ў Польшчы (лістапад 2002 — чэрвень 2003 г.); падакументныя вопісы калекцыі рукапісаў Т. Неваднічанскага ў Каралеўскім Замку ў Варшаве [2, 3].

Сярод відаў матэрыялаў калекцыі вылучаюцца:

- картаграфічныя матэрыялы (мапы, малюнкі мясцовасці, гравюры з выглядам гарадоў і інш.);
- партрэты манархаў і іншых гістарычных асоб (малюнкі, гравюры);
- дакументы актавага характару;
- карэспандэнцыя.

Сярод найкаштоўнейшых аб’ектаў картаграфіі, што маюць адносіны да тэрыторыі ВКЛ і Беларусі, можна назваць наступныя:

- каляровая мапа Полацкага ваяводства («Полацкага княства») перыяду вызваленчых паходаў Стэфана Баторыя, аўтар — Станіслаў Пахалавіцкі (1580 г.) [3];
- мапа ВКЛ Томаша Макоўскага, картографа князёў Радзівілаў, першапачаткова створаная ў 1603 г. (або 1613 г.) у выглядзе яе каляровага перавыдання Вільямам Блаем (Willem Janszoon Blaeu) 1631 г., адметная наяўнасцю другой часткі — мапы р. Днепр (маштаб часткі з ВКЛ 1 : 1 300 000; маштаб часткі з р. Днепр 1 : 1 530 000) [3];
- мапа Рэчы Паспалітай Карла Аларда (Carel Allard), каля 1697 г.

Трэба адзначыць знакамітую насценную гравюру (100,5 см × 35,5 см) Гродна Маціяса Цюндта (Mathias Zündt) па малюнку Ёхана Адэльгаўзера (ням. Johannes Adelhauser) «Сапраўднае апісанне горада Гродна ў Літве» (лац. «Vera designatio urbis in Littavia Grodnae»), упершыню выдадзеную ў 1568 г. у Нюрнбергу і перавыдадзеную ў 1575 г. Браўнам і Гогенбергам (Braun, Hogenberg) у альбоме «Civitates orbis terrarum...»[6].

[6] Т. Неваднічанскі набыў экзэмпляр гравюры Адэльгаўзера-Цюнта ў 1979 г. у спадкаемцаў графа Гутэн-Чапскага ў Рыме. У 1983 г. калекцыянер увёў яе ў навуковы зварот, зрабіўшы падрабязнае апісанне і якасную публікацыю выявы гравюры: Niewodniczanski T. Grodno — Bemerkungen zur Panorama-Vedute von Adelhauser / Zьndt 1568 (mit einer Falttafel) // Lьneburger Beitrдge zur Vedutenforschung. Lьneburg : Nordostdeutsches Kulturwerk, 1983. S. 103—108.

Да гэтага ж можна дадаць шэраг выяваў іншых гарадоў Рэчы Паспалітай з выдання Браўна і Гогенберга «Civitates orbis terrarum...» і інш.

Самастойнай часткай калекцыі з'яўляюцца так званыя «Рукапісы» — рукапісныя афіцыйныя дакументы, якія паходзяць з канцылярый манархаў, дзяржаўных і рэлігійных органаў і дзеячаў ВКЛ і Кароны Польскай, замежных канцылярый. Рукапісы датуюцца канцом XV—XVIII ст. Агульную колькасць актаў высветліць не атрымалася. Аднак на падставе толькі некалькіх даступных тамоў інвентароў можна меркаваць, што іх не менш за 4000.

Асаблівай каштоўнасцю з'яўляюцца:

• дакументы манархаў ВКЛ і Кароны Польскай (лісты, прывілеі, «універсалы»): каралевы польскай Эльжбеты Ракузкай (да Сафіі Ягелонкі, жонкі маркграфа Фрыдэрыка V), Жыгімонта I Старога і Боны Сфорцы, Жыгімонта II Аўгуста і Барбары Радзівіл, Генрыха Валуа, Стэфана Баторыя і каралевы польскай Ганны Ягелонкі, Жыгімонта III Вазы, Уладзіслава IV і каралевы польскай Цэцыліі Рэнаты Габсбуржанкі, Яна Казіміра, Станіслава Ляшчынскага, Аўгуста III, Станіслава Аўгуста Панятоўскага;

• лісты манархаў іншых еўрапейскіх дзяржаў: караля чэшскага Уладзіслава Ягелончыка, электара брандэнбургскага Яна Жыгімонта, караля англійскага Караля I Сцюарта, караля прускага Фрыдэрыка II;

• перапіска з Ватыканам (лісты Сікста V, Клеменса VIII, Урбана VIII, апостальскіх нунцыяў, кардыналаў, біскупаў);

• афіцыйныя акты іншых дзяржаўных дзеячаў Кароны Польскай і ВКЛ;

• дакументы камандуючага запарожскіх войск Рыгора Лабоды;

• лісты да магістратаў гарадоў РП: Вільні, Гданьска, Познані, Кракава, Львова.

Адметна, што калекцыя дазваляе асвятліць пэўныя аспекты перыяду кіравання Жыгімонта I і Жыгімонта II Аўгуста, гісторыю Смаленскага ваяводства ў XVII ст. (маёнткі, рэлігійныя і дзяржаўныя пасады, кляштар бенедыктынак смаленскіх, уладанне Катынь), тэму гісторыі езуітаў полацкіх, Пінскага езуіцкага калегіума, справу кананізацыі Іасафата Кунцэвіча (1663 г.) і інш. [3].

Паколькі цікавасць аўтара артыкула да азначанай калекцыі першапачаткова была абгрунтавана тэматыкай уласных даследаванняў (гісторыя і склад архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, аналіз яго дакументальных страт), варта асобна ахарактарызаваць акты, якія адносяцца да гісторыі роду Радзівілаў. Колькасць гэтых дакументаў невялікая.

Дакументы адносяцца да XVI—XVIII стст. і адлюстроўваюць розныя аспекты гісторыі прадстаўнікоў роду Радзівілаў: Яна Мікалаевіча, Мікалая Чорнага, Мікалая Рудога і іх нашчадкаў. Ёсць і ўнікальныя, напрыклад, два лісты Барбары Радзівіл [1] (гл. табліцу).

**Дакументы з калекцыі Т. Неваднічанскага (на падставе каталога «Imago Poloniae» і выбраных інвентароў рукапіснай часткі калекцыі), адрасаваныя прадстаўнікам роду Радзівілаў**

| Уліковы нумар | Назва дакумента | Дата стварэння | Месца стварэння |
|---|---|---|---|
| 10104 | Ліст Жыгімонта І Старога да земскага маршалка ВКЛ Яна Мікалаевіча Радзівіла з просьбай аб удзеле ў камісарскім судзе па справе маршалка, пісара каралеўскага, камянецкага дзяржаўцы Богуша Багавіцінавіча з Блізнаковічамі, папера, старабел. м. | 17.09.1519 | Кракаў |
| 10105 | Ліст Жыгімонта І Старога да земскага маршалка Яна Мікалаевіча Радзівіла па справе спрэчкі паміж Богушам Багавіцінавічам і Марцінам Мялешкавічам з абяцаннем разсудзіць спрэчку аб сваім прыездзе ў ВКЛ, папера, старабел. м. | 15.05.1520 | Торунь |
| 10123 | Ліст каралевы Барбары Радзівіл да брата, Мікалая Радзівіла Рудога, падчашага ВКЛ з пажаданнямі згоды і заканчэння спрэчак | 28.09.1549 | Кракаў |
| 10124 | Ліст каралевы Барбары Радзівіл да пляменнікаў Мікалая і Крыштафа Радзівілаў, сыноў Мікалая Радзівіла Рудога з пажаданнямі, папера, пол. м. | 11.06.1550 | Кракаў |
| 10132 | Ліст Жыгімонта ІІ Аўгуста да ваяводы Троцкага, гетмана ВКЛ Мікалая Радзівіла Рудога з пажаданнем увядзення гаспадарскага баярына Шымкі Лубніцкага ў правы ўласніка пустым надзелам зямлі Сачоўшчызна Тарашчыцкай воласці Троцкага ваяв., папера, старабел. м. | 12.06.1558 | Берасце |
| 10122 | Ліст Жыгімонта ІІ Аўгуста да ваяводы Віленскага канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла Чорнага з пацвярджэннем надання дзяржавы ў маёнтку Краснасяло Шчаснаму Абрамовічу і яго жонцы, папера, старабел. м. | 23.04.1562 | Вільна |

*Працяг табліцы*

| Уліковы нумар | Назва дакумента | Дата стварэння | Месца стварэння |
|---|---|---|---|
| 10201 | Прывілей Генрыха Валуа ваяводзе навагрудскаму Мікалаю Радзівілу на пасаду лоўчага ВКЛ пасля адмовы ваяводы смаленскага Рыгора Валовіча, папера, старабел. м. | 02.03.1574 | Кракаў |
| 10206 | Універсал Стэфана Баторыя да Мікалая Радзівіла Рудога па справе ваеннай дапамогі Інфлянтам, падрыхтоўкі да вайны з Маскоўскай дзяржавай і заклікам узначаліць паспалітае рушанне, папера, старабел. м. | 30.08.1577 | Глова |
| 10306 | Ліст Жыгімонта III Вазы да кардынала, кракаўскага біскупа Юрыя Радзівіла па справе спрэчкі паміж Себасцьянам Мантэлупі і Філіпа Франчэскі, папера, пол. м. | 08.07.1598 | Мальбарк |
| 10325 | Ліст Жыгімонта III Вазы да ваяводы віленскага Мікалая Крыштафа Радзівіла і магістрата Вільні з загадам выканання яго дэкрэта аб смяротным пакаранні Адама Пудрыцкага за ўдзел у разбурэнні пратэстанцкага збора і спаленне дома Яна Вялічкі, стольніка ашмянскага ў Вільні 2 ліпеня 1611 г., папера, пол. м. Подпіс Льва Сапегі | 02.02.1615 | Варшава |
| 10326 | Прывілей (універсал) Жыгімонта III Вазы Ганне з князёў Курляндзкіх Радзівіл з пацвярджэннем запісу яе сыну Яну Альбрэхту сумы ў 60 000 талераў разам з местам Давідгарадок, папера, пол. м. | 27.03.1615 | Варшава |
| 10409 | Прывілей Уладзіслава IV Вазы вялікаму канцлеру ВКЛ, старасце пінскаму, гнеўскаму і тухольскаму Альбрэхту Станіславу Радзівілу на войтаўства стараконьскае Пінскага павета з дазволам яму і яго жонцы Рэгіне з Аёзэнрайхаў на далучэнне да войтаўства мястэчка Небель з возерам, папера, пол. м. | 20.10.1634 | Львоў |

*Заканчэнне табліцы*

| Уліковы нумар | Назва дакумента | Дата стварэння | Месца стварэння |
|---|---|---|---|
| 10412 | Прывілей Уладзіслава IV ваяводзе віленскаму, гетману ВКЛ Крыштафу Радзівілу на збіранне мыта на мастах праз рэкі Віжунка і Святая, пол. м. | 07.03.1637 | Варшава |
| 10503 | Універсал Яна Казіміра канцлеру ВКЛ Альбрэхту Станіславу Радзівілу па справе адабрання Ляшчынскага манастыра з яго маёнткамі з рук ксяндза Юзафа Тукальскага і перадачы архімандрыту бярозавіцкаму ксяндзу Габрыэлю Календу, пасля надання манархам, польск. м. | 28.08.1651 | |
| 10509 | Ліст Яна Казіміра Марыі Лукрэцыі са Строццы Радзівіл са спачуваннем з нагоды смерці мужа — вялікага маршалка ВКЛ, ваяводы полацкага Аляксандра Людвіка Радзівіла | 21.05.1654 | Варшава |
| 11103 | Пацвярджальны прывілей Станіслава Ляшчынскага вялікаму канцлеру ВКЛ Каралю Станіславу Радзівілу прывілею Яна III Сабескага на Астроскае староства Кіеўскага ваяв., папера, пол. м. | 12.07.1708 | Мальбарк |
| 14040 | Ліст Аўгуста II да ваяводы навагрудскага Мікалая Фаўстына Радзівіла з паведамленнем аб намінацыі Яна Ежы Флеменга на пасаду генерала артылерыі ВКЛ і рэгімента драгунаў, на якую прэтэндаваў Радзівіл, і абяцаннем памятаць аб ім, папера, франц. м. | 29.06.1738 | Марыбург |
| 11820 | Патэнт Станіслава Аўгуста Панятоўскага Мікалаю Радзівілу, былому палкоўніку пешага грэнадзёрскага палка войска ВКЛ на чын палкоўніка рэгімента пешага Радзівілаўскага войска ВКЛ, пад шэфствам ваяводы віленскага, генерал-лейтэнанта Караля Радзівіла | 07.10.1789 | Варшава |
| 14168 | Ліст маршалка Луіса Даву (Louis Davout) да Гелены з Пжэздзецкіх Радзівілавай з запрашэннем на баль | 19.12.180? | Варшава |

Цікава тое, што, нягледзячы на выразную *лагічную* сувязь «радзівіліяны» з архіўнымі зборамі роду Радзівілаў (як мінімум адрасаванасць ім), іншых прыкмет паходжання, напрыклад адзнак архіўнага ўліку, на дакументах не выяўлена. Адзіным выключэннем з'яўляецца прысутнасць на асобных дакументах штампа зялёнага колеру, які ўказвае на папярэдняга ўладальніка (прыблізна 10 × 15 мм, на верхнім баку аркуша пад тэкстам, авальнай формы за выявай герба «Ляліва» і надпісам па коле: верхняя палова — «ARCHIWUM», ніжняя палова — «CZERWONODWORSKIE»). Тыльны бок дакументаў, як правіла, фактычна ідэальна чысты, што з'яўляецца рэдкай з'явай для манускрыптаў, перажыўшых шматвекавую гісторыю захоўвання. Такім чынам, знешнія асаблівасці дакументаў выклікаюць пытанне. Па меркаванні аўтара, такі стан гістарычнага дакумента без свядомага ўмяшання чалавека (з мэтай пазбаўлення яго прыкмет паходжння) — немагчымы (ад згаданага штампа зялёнага колеру хімічным спосабам пазбавіцца складана).

Разам з тым трэба адзначыць, што рукапісная частка калекцыі Т. Неваднічанскага не дазваляе цалкам асвятліць пэўную падзею, працэс, перыяд, паколькі ўяўляе сабой збор, створаны з дастаткова разрозненых, часам адзінкава прадстаўленых гістарычных дакументаў. Гэта натуральна, бо мы маем справу з тыповай калекцыяй, а не з архіўным фондам, што ўяўляў бы сабой не толькі лагічную, але і гістарычную цэласнасць, з'яўляючыся сфарміраваным з дакументаў, аб'яднаных агульным паходжаннем.

Калекцыя Т. Неваднічанскага — важны комплекс матэрыялаў, нават абавязковы для выканання патрабавання паўнаты базы крыніц, аднак ён можа быць выкарыстаны ў працэсе гістарычнага даследавання толькі як дадатковы, але не базавы.

На цяперашні момант матэрыялы калекцыі Т. Неваднічанскага захоўваюцца ў Каралеўскім Замку ў Варшаве і з'яўляюцца даступнымі для даследчыкаў. Захавальнік калекцыі — доктар К. Казіца, выпускнік Вроцлаўскага ўніверсітэта, знаўца польскай картаграфіі, супрацоўнік аддзела картаграфіі Інстытута геаграфіі Вроцлаўскага ўніверсітэта, паплечнік Т. Неваднічанскага ў апрацоўцы калекцыі і арганізацыі праектаў яе папулярызацыі, аўтар шэрагу навуковых публікацый у галіне гістарычнай картаграфіі[7].

[7] Аўтар выказвае шчырую падзяку пану Казіміру Казіцы за прадастаўленне доступу да збору і каштоўныя кансультацыі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Zamek Królewski w Warszawie. Kolekcja Tomasza Niewodniczanskiego. Rękopisy. Sygn. : 10104. — Ліст Жыгімонта I Старога да земскага маршалка ВКЛ Яна Мікалаевіча Радзівіла з просьбай аб удзеле ў камісарскім судзе па справе маршалка, пісара каралеўскага, камянецкага дзяржаўцы Богуша Багавіцінавіча з Блізнаковічамі, 17.09.1519, Кракаў; 10105. — Ліст Жыгімонта I Старога да земскага маршалка Яна Мікалаевіча Радзівіла па справе спрэчкі паміж Богушам Багавіцінавічам і Марцінам Мялешкавічам з абяцаннем разсудзіць спрэчку аб сваім прыездзе ў ВКЛ, 15.05.1520, Торунь; 10123. — Ліст каралевы Барбары Радзівіл да брата, Мікалая Радзівіла «Рудога», падчашага ВКЛ з пажаданнямі згоды і заканчэння спрэчак, 28.09.1549, Кракаў; 10124. — Ліст каралевы Барбары Радзівіл да пляменнікаў Мікалая і Крыштафа Радзівілаў, сыноў Мікалая Радзівіла «Рудога» з пажаданнямі, 11.06.1550, Кракаў; 10132. — Ліст Жыгімонта II Аўгуста да ваяводы Троцкага, гетмана ВКЛ Мікалая Радзівіла «Рудога» з пажаданнем увядзення гаспадарскага баярына Шымкі Лубніцкага ў правы ўласніка пустым ўчасткам зямлі Сачоўшчызна Троцкага ваяв., 12.06.1558, Берасце.

2. Imago Poloniae: Das Polnisch-Litauische Reich in Karten, Dokumenten und alten Drucken in der Sammlung von Tomasz Niewodniczański : 2 t. / red.: Tomasz Niewodniczański; tłumaczenie na niemiecki: Arnold Bartetzky. Warszawa: Wyd. Agencja Reklamowo-Wydawnicza A. Grzegorczyk, 2002.

3. Imago Poloniae. The polish-lithuanian commonwealth in maps, documents, and old prints in the collection of Tomasz Niewodniczacski. Exhibition. Warszawa, 2002.

4. Гравюра Адэльгаўзера-Цюнта [Электронны рэсурс]. URL: http://be.wikipedia.org/wiki/Гравюра Адэльгаўзера-Цюнта (дата звароту : 15.01.2014).

Артыкул паступіў у рэдакцыю 15 чэрвеня 2014 г.